*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 14. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

### *ПРОЗА*

1. Паразважайце над пытаннем: Чаму ў сучаснай беларускай прозе на першае месца выходзіць маральна-этычная праблематыка? Назавіце творы, у якіх яна найбольш востра закранаецца і раскрываецца.

2. Напішыце **эсэ** «Проза якіх аўтараў твораў пра мінулае мне найбольш імпануе».

3. Падрыхтуйце **літаратурна-музычную кампазіцыю** «Экалогія прыроды і чалавечай душы».

4. Правядзіце **міні-віктарыну** па пытаннях:

*1. У адным з твораў беларускага празаіка выкарыстаны вершы М. Лермантава, А. Блока, М. Багдановіча і іншых аўтараў. Як ён называецца? Хто яго аўтар?*

*2. Назавіце творы беларускіх празаікаў, у якіх галоўным «героем» з’яўляецца лес?*

*3. Вобраз дарогі – адзін з галоўных у беларускай літаратуры. Такія вобразы, што маюць даўнюю гісторыю ў сусветнай літаратуры, называюцца архетыпамі. У якіх творах беларускіх пісьменнікаў (эпічных, лірычных, драматычных) гэты вобраз адыгрывае галоўную ролю, мае найвялікшую ідэйна-эстэтычную каштоўнасць?*

*4. Твор вядомага беларускага празаіка, які страціў на вайне бацькоў, нават гадаваўся ў дзетдоме, раманнага жанру і зборнік народнага паэта – земляка Васіля Быкава носяць аднолькавую назву, якая азначае некранутасць прыроды, неабходнасць захавання гармоніі ўзаемаадносінаў паміж навакольным светам і чалавекам. Што гэта за творы?*

*5. Сасна – вызначальнае дрэва для краявідаў, аблічча беларускай прыроды і нават у пэўнай ступені характару беларусаў. У некаторых творах беларускіх пісьменнікаў яно выносіцца ў загаловак. Назавіце такія творы. Нагадаем, што адзін пісьменнік і літаратуразнавец у адначассе выкарыстаў гэтую назву двойчы ў загалоўках сваёй раманнай трылогіі. Другі паэт атрымаў за зборнік вершаў Ленінскую прэмію.*

5. Падрыхтуйце **паведамленне** пра Чарнобыльскую аварыю. Падрыхтуйце **ілюстрацыю** да аднаго эпізодаў твора, адлюстроўваючы назву «Чарнобыльская малітва». Пракаменціруйце малюнак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Складзіце **анталогію** «Сучасная беларуская проза».

7. Напішыце ці падрыхтуйце вусна **водзыў** на ваш любімы празаічны твор сучаснага пісьменніка: «Я раіў бы прачытаць».

8. Падрыхтуйце **даклад** на адну з тэм:

Горад і Вёска як вобразы-сімвалы ў сучаснай беларускай прозе (паэзіі).

Вобраз Чарнобыля ў беларускай прозе другой паловы 1980-х—1990-х гадоў.

Вобраз сучасніка ў прозе Андрэя Федарэнкі.

«Міфалагічны рэалізм» прозы Віктара Казько.

Дабро і Зло як два палюсы жыцця ў апавяданнях Анатоля Казлова.

Сучасны беларускі дэтэктыў: вытокі і здабыткі жанру.

Фантастыка і фэнтэзі ў сучаснай беларускай літаратуры.

9. Падрыхтуйце **праект** (на выбар):

**«XX+I»** (стварэнне біябібліяграфічнага даведніка, прысвечанага найбольш знакамітым беларускім празаікам мяжы XX—XXI стагоддзяў).

**«З талентамі — пра талент»** (стварэнне цыклаў аўдыё- альбо відэагутарак з пісьменнікамі).

**«Музей сучаснасці»** (стварэнне рэальнай ці віртуальнай экспазіцыі, прысвечанай літаратурным суполкам, рухам, таварыствам, якія ўдзельнічаюць у літаратурным жыцці Беларусі 1990-х—2000-х гадоў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ